максімуму. Больш радыкальныя патрабаванні, унесеныя ў праграму пад націскам знізу, прывялі да хвалі расколаў у гэтым клубе. Зрэшты ж галоўнай перашкодай для кааліцыі з польскай дэмакратыяй па аграрным пытанні было яе імкненне вырашыць аграрныя праблемы за кошт Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Шавіністычныя пазіцыі польскіх партый пры абвастрэнні сацыяльных канфліктаў і нацыянальных супярэчнасцяў у Заходняй Беларусі прывялі да тактычных разыходжанняў сярод членаў БПК. Летам 1924 г. Валошын, Тарашкевіч і Мятла схіляюцца да супрацоўніцтва з Камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі. Пасля перамоў з кіраўнікамі КПЗБ яны ўвайшлі ў склад Беларускай партыі незалежных сацыялістаў, а ў 1925 г. разам з Рак-Міхайлоўскім утварылі асобны клуб у сейме – фракцыю Беларуская сялянска-работніцкая грамада. У складзе БПК засталіся Аўсянік, Кахановіч, Рагуля, Станкевіч і Ярэміч.

Заканатворчая дзейнасць беларускіх дэпутатаў увасобілася ў законапраекце аб аграрнай рэформе, які быў распрацаваны сумесна з фракцыямі камуністаў і «незалежных людаўцаў» і прадстаўлены для разгляду сейма ўлетку 1925 г. Ён прадугледжваў канфіскацыю панскіх, царкоўных і манастырскіх зямель з усёй рухомай і нерухомай маёмасцю і перадачу іх сялянскім камітэтам для бясплатнага размеркавання. У першую чаргу зямлю павінны былі атрымаць батракі, дробныя арандатары, беззямельныя і малазямельныя жыхары бліжэйшых ваколіц. Лясы і воды прапанавалася нацыяналізаваць [3].

Урэшце, уключэнне беларускіх дэпутатаў сейма ў барацьбу за стварэнне рабоча-сялянскага ўрада станавілася адзіна перспектыўным накірункам, які адкрываў магчымасці шырокай дэмакратычнай зямельнай рэформы, паколькі парламенцкія спробы былі вычарпаны і не ўдаліся.

## ЛІТАРАТУРА


1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі.–Т. 1.– Мн., 1993.– С. 451, 458.
2. Ладысеў У. Заходняя Беларусь у 1921–1939 гг. // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў.–Мн., 2000.–С. 168.
3. Цітова А. Беларускі дэпутацкі клуб і праблема аграрнай рэформы ў польскім сейме // Беларусіка.–Мн., 1994.–С. 272, 273.


УДК 947.6.01 «18/19»

І.У. Каляда, ст. выкладчык

# ДЗЕЙНАСЦЬ КААПЕРАТЫЎНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БССР У 1920-Я ГАДЫ

The article dwells upon the activities of cooperative organizations in Belarus in the 1920-ies.

У адрозненне ад прыватных прадпрыемстваў і акцыянерных таварыстваў кааперацыя мае сваю спецыфіку, і перш за ўсё – гэта прыярытэт сацыяльных і культурных мэт адносна ўласна эканамічных у практычнай дзейнасці кааператываў. Ва ўсякім выпадку менавіта гэтая рыса была найбольш адметнай яшчэ для тых часоў, калі кааператыўны рух толькі пачынаў вызначаць сваё месца ў эканоміцы і грамадстве, а таксама і тады, калі ён заняў трывалыя пазіцыі ў жыцці большасці цывілізаваных краін.

Аб уласнай сувязі кааператыўнай дзейнасці з культурай сведчыць практыка кааператыўнага руху 20-х гадоў на Беларусі.

Прыкладна да сярэдзіны 1923 г. у дзейнасці кааператыўных арганізацый БССР не назіраецца колькі-небудзь адметнай актыўнасці ў культурна-асветніцкай галіне. Гэта можна растлумачыць заняпадам кааперацыі ў выніку першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, а таксама амаль што поўным кантролем Савецкай улады і бальшавіцкай партыі над кааперацыяй, які ўсталяваўся ў 1918–1920 гадах.

Некаторае ажыўленне кааператыўнага руху назіраецца пасля прыняцця ЦВК РСФСР пастаноў ад 7.04.21 г., дзе абвяшчалася добраахвотнае членства ў кааперацыі (раней яно было абавязковым) і адмяняўся папярэдні кантроль у адносінах да кааперацыі [1]. Але сапраўдная актывізацыя грамадска-культурнай дзейнасці кааперацыі БССР пачынаецца з канца 1923 – пачатку 1924 г., калі Беларускім саюзам сельскагаспадарчых і прамысловых кааператываў былі арганізаваны курсы для сваіх супрацоўнікаў і членаў іх сем'яў па ліквідацыі непісьменнасці (вялося навучанне чытанню, пісьму, арыфметыцы), дзе, акрамя таго, вывучалася і гісторыя кааперацыі на Беларусі, асаблівасці і задачы розных яе відаў.

З 1924 г. па сістэме спажывецкай кааперацыі БССР рэгулярна праводзілася адлічэнне сродкаў на культурныя патрэбы, бралася шэфства над вясковымі школамі. У саміх спажывецкіх таварыствах працавалі культурна-асветныя гурткі і бібліятэкі.

Пры самым непасрэдным удзеле кааперацыі БССР у сярэдзіне 20-х гадоў адбывалася ўвядзенне метрычнай сістэмы мер, што, зразумела, патрабавала павышэння адукацыйнага і культурнага ўзроўню насельніцтва. Каб дапамагчы сялянам зразумець новую сістэму, Беларускі саюз сельскагаспадарчай кааперацыі разгарнуў шырокую культурна-асветніцкую работу, дзякуючы якой метрычная сістэма была ўведзена ўжо да жніўня 1925 г. [2].

Адной з формаў культурна-асветніцкай дзейнасці кааперацыі была падрыхтоўка спецыялістаў для работы ў кааператыўных арганізацыях. З гэтай мэтай наладжваліся курсы для кіраўнікоў кааператываў і перападрыхтоўкі інструктараў, у праграме якіх значная ўвага надавалася палітычнай адукацыі. Беларускі саюз сельскагаспадарчай кааперацыі аказваў дапамогу студэнтам ВНУ, якіх планавалася накіраваць на кааператыўную работу, адлічваючы сродкі на стыпендыі (не менш за 5% штогадовых прыбыткаў усіх звёнаў і відаў сельскагаспадарчай кааперацыі) [3]. Тут трэба заўважыць, што ў многіх выпадках такія рашэнні аб адлічэнні на культурную работу пэўнага працэнта чыстага прыбытку прымаліся не добраахвотна, а пад націскам партыйных органаў і не спрыялі ўмацаванню самой кааперацыі.

Адзначым яшчэ адзін цікавы факт: да 1927 г. у некаторых сямігадовых школах існавалі класы з кааператыўным ухілам, вучні якіх потым паступалі ў Віцебскі кааператыўны тэхнікум. Аднак партыйныя і дзяржаўныя ўлады не задавальняла тое, што з выпускнікоў гэтых школ у тэхнікум паступалі асобы непадыходзячага сацыяльнага складу (сярод іх было мала дзяцей рабочых і сялян), таму гэтыя класы былі ліквідаваны.

Падобныя захады становяцца зразумелымі, калі мець на ўвазе тое, што прыкладна з 1927 г. назіраецца павышэнне цікавасці кампартыі да палітычнай работы ў кааперацыі. І ў першую чаргу гэта датычылася справаздачна-перавыбарчых кампаній, галоўнай задачай якіх было павышэнне ўдзельнай вагі беднаты і серадняков у кіраўніцтве кааперацыяй за кошт служачых. Мэта тут відавочная: заваяванне палітычнага кантролю над кааперацыяй. І мэта гэта была дасягнута, хаця і не абышлося без барацьбы. Перавыбарчыя кампаніі ў кааперацыі былі амаль што адзінай магчымасцю публічнага выказвання палітычнай пазіцыі сялянства, праяўлення яго

палітычнай актыўнасці. На шэрагу перавыбарчых сходаў каапераціі выказвалася адкрытая незадавальненне палітыкай Савецкай улады. Зразумела, што такія праявы кіруючай уладзе былі непатрэбны, таму і прыкладваліся намаганні па ўсталяванню татальнага кантролю над каапераціяй.

Пад пастаянным кантролем партыйных органаў знаходзіўся і кааператыўны друк. Калі кааператыўныя перыядычныя выданні першай паловы 20-х гадоў («Беларускі кааператар», бюлетэні Віцебскага і Гомельскага губернскіх саюзаў кааператараў) адрозніваліся адноснай самастойнасцю ў сваёй дзейнасці, то кааператыўная перыёдыка другой паловы 20-х гадоў («Кааперацыйнае жыццё», «Кааперацыя БССР») стала толькі сродкам барацьбы за праграмныя мэты бальшавікоў: фактычна, работа кааперацыі па лініі агітацыі і прапаганды кааператыўных ідэй вялася ўжо не з пункту гледжання іх афармлення ў самастойную ідэалогію, а з пазіцый «інтарэсаў рэвалюцыі і пабудовы кааперацыі як сродку класавай барацьбы» [4].

З канца 20-х гадоў у грамадска-культурнай рабоце кааперацыі БССР значнае месца займала атэістычная прапаганда. Але ж набыла яна не столькі грамадска-культурны, колькі палітычны і ідэалагічны характар. Гэта і зразумела, бо, заваяваўшы кааперацыю, партыя і ўлада пачалі скарыстоўваць яе ў якасці інструмента сваёй палітыкі. Так, вясной 1929 г. на агульным сходзе дзвюх інвалідных арцеляў Мінска разглядалася пытанне аб пераносе выхадных дзён з велікодных свят на 1–3 мая. Большасць тых, хто выказаўся, былі супраць такога пераносу, а некаторыя нават саму пастаноўку пытання лічылі вынікам «уціску партыі на масы». Аднак пад пагрозай выключэння з арцеляў у выпадку нявыхаду на працу ў Вялікдзень большасць сходу (92 са 100 прысутных) вырашыла перанесці выхадныя на 1–3 мая [5]. Зразумела, што пададзена гэта было як асабістая ініцыятыва кааператараў.

У адпаведнасці з дырэктывамі кіруючых органаў кааперацыі БССР, колькасць якіх з другой паловы 1930-х гадоў значна павялічвалася, нізавыя арганізацыі павінны былі выдзяляць са сваіх культурных фондаў сродкі на разгортванне антырэлігійнай прапаганды, арганізоўваць масавае ўступленне пайшчыкаў у Саюз ваяўнічых атэістаў, праводзіць суботнікі, сачыць за недапушчэннем гандлю рэлігійнымі сімваламі і інш.

Яшчэ адным з напрамкаў культурна-асветніцкай работы кааперацыі БССР было забеспячэнне вясковага насельніцтва кінафільмамі. Звычайна кінатаварыствы ствараліся некалькімі кааператывамі, якія маглі набываць ва ўласнасць ці арандаваць кінафільмы і кінаапараты, памяшканні для кінатэатраў і кінасеансаў. Зразумела, што кінапраца кааперацыі на вёсцы прадугледжвала не толькі ўздым культурнага ўзроўню сялян, але і павінна была спрыяць агітацыі за новы лад жыцця, змаганню супраць перажыткаў мінулага, за калектывізацыю. Цікава, што ў мэтах заахвочвання да кінасеансаў выкарыстоўвалася пэўная сістэма льгот у цэнах на білеты: найменш плацілі члены калгасаў, саўгасаў, прафсаюзаў і бедната, частка якой нават прапускалася бясплатна (па дамоўленасці з камітэтамі сялянскай узаемадапамогі).

Падпарадкаванне кааперацыі партыйна-дзяржаўным структурам прывяло да яе фактычнай ліквідацыі як адносна самастойнай эканамічнай і грамадска-палітычнай арганізацыі. Да пачатку 30-х гадоў выявілася тэндэнцыя паступовай падмены ўласна кааператыўных мэт у культурна-асветніцкай рабоце кааперацыі на мэты палітычныя (у першую чаргу, па ўзмацненню партыйнага і ідэалагічнага ўплыву). Кааперацыя ў БССР ператварылася ў элемент дзяржаўнай сістэмы.

ЛІТАРАТУРА

1. Кустарная и мелкая промышленность и промысловая кооперация.–М., 1923.– С. 167.
2. НАРБ. Ф. 334, воп.1, сп. 88, ар. 12.
3. НАРБ. Ф. 334, воп.1, сп. 927, ар. 69.
4. НАРБ. Ф. 12, воп. 1, сп. 137, ар. 77.
5. Котаў І.С. Аб палітычнай дзейнасці кааперацыі ў БССР у 20-я гады // Весці АН Беларусі.–1994.–№ 3.– С. 91.

УДК 321. 8 (476)

П.С. Крючек, ст. преподаватель

## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКИХ ОРГАНИЗАЦИЙ МОЛОДЕЖИ БЕЛАРУСИ В 90-Е ГГ. XX В.

The article dwells upon the process of creation and functioning of youth organizations in Belarus in the 90-ies of the XX century.

Белорусское общество на рубеже XX–XXI вв. находилось на стадии глубоких социально-экономических преобразований. Трансформация социально-экономической и политической жизни сопровождалась реформированием старых и появлением новых общественно-политических организаций молодежи. Пик активности этого процесса пришелся на конец 80-х гг. Первыми такими организациями в Беларуси были созданные в 1987 г. «Талака», национально-культурное объединение молодежи, политические дискуссионные клубы «Современник», «Світанак», «Тутэйшыя» и др. Их деятельность носила в основном культурно-просветительный и экологический характер.

Во второй половине 90-х гг. в Беларуси существовало около 60 молодежных организаций. Наиболее массовыми из них являлись Белорусский союз молодежи (БСМ), возникший как правопреемник распавшегося комсомола, Белорусский патриотический союз молодежи (БПСМ), Молодой Фронт, Молодые социал-демократы, Объединение белорусских студентов и др. Рассмотрим основные направления деятельности некоторых из них.

Наиболее активной молодежной организацией национальной направленности в Беларуси является Молодой Фронт. Первые организационные структуры Молодого Фронта начали возникать на волне массовых выступлений весной 1996 г. Первоначально это была консолидация молодежного крыла БНФ. Однако постепенно Молодой Фронт начинает оформляться как самостоятельная политическая сила. Первой самостоятельной акцией Молодого Фронта стало празднование Дня Святого Валентина 14 февраля 1997 г., когда прошел многочисленный студенческий марш возле посольств западных государств под лозунгами «Беларусь в Европу» и «Молодежь за Беларусь». Летом 1997 г. Молодой Фронт окончательно оформился как самостоятельная общереспубликанская общественно-политическая организация. Первоначально ее деятельность носила ярко выраженный радикальный характер. Предпочтение отдавалось уличным акциям, которые зачастую приводили к открытому столкновению с милицией и возбуждению ряда уголовных дел.

Акции весны 1998 г. показали поражение уличного радикализма и сужение молодежного движения. В этих условиях произошло изменение тактики Молодого Фронта. Вместо уличных акций, которые перестали давать эффект, уклон стал делаться на куль-